**Кастусь Жмінько**

# НАКАНАВАНЫ НЕСПАКОЙ

Гайнаўка-Брэст 2008

TOWARZYSTWO OCHRONY KRAJOBRAZU

Жмінько, К.Ф.
Наканаваны неспакой: вершы / Кастусь Жмінько

Вершы Кастуся Жмінько – гэта сталы, дапытлівы роздум аб лёсе роднага краю, аб вечных праблемах дабра і зла. Хвалюючыя радкі прысвечаны каханню, шчымлівым згадкам маладосці.

Асобным вершам паэта ўласцівы дасціпная іронія і едкая сатыра.

# ЯШЧЭ ПРА ГАЛОЎНАЕ

Імя Кастуся Жмінько вядома прыхільнікам паэтычнага слова з сямідзесятых гадоў па публікацыях у перыядычным друку, але першая кніга паэзіі "Між вамі..." з'явілася толькі ў канцы дзевяностых, што засведчыла патрабавальнасць аўтара да слова, высокую ступень самакрытычнасці.

Не проста і не хутка рыхтаваўся таксама гэты зборнік. Чытач са стажам заўважыць, што многія вершы паэта былі створаны ў тую пару, калі пачыналася наша дзяржаўная незалежнасць, таму і нясуць яны адзнаку часу, адметную публіцыстычнасць, узнёсласць, вылучаюцца энергіяй радка. Але ў той жа час аўтар не зрываецца на крык, не пераходзіць на пустую рыторыку.

"Наканаваны неспакой" – зборнік сталага, багатага пражытым творцы пра галоўнае: чалавечую і грамадзянскую пазіцыю нашага сучасніка на зямлі, яго месца на "планеце людзей". Добра сказала пра гэта Ніна Мацяш: "Яго ціхмяны, вычулены, шчымліва-роздумны паэтычны голас заўсёды адметны не толькі жывой інтанацыяй адданай любові да роднай зямлі, мовы і духоўнай спадчыны беларускага народа, але й сыноўнай адказнасцю за яго будучыню."

У сваёй творчасці Кастусь Жмінько найперш вяртаецца да вытокаў. Уражваюць радкі верша, прысвечанага Алесю Каско:

*Маё сэрца ляціць вінавата,*
*Як між зорак апошняя знічка,*
*Над старою пахіленай хатай,*
*Над сівою засмучанай дзічкай.*

Любімая паэтычная форма аўтара – кароткі (чатыры – восем радкоў) верш з выразнай, лаканічнай, неразмытаю думкай:

*Стаіць няўцямна на памосце*
*Самотны гаспадар святліцы*
*Прыйшлі няпрошаныя госці –*
*Няма куды слязе скаціцца.*

(“Пахаванне ў Выверах”)

Кастусь Жмінько ведае жыццё, як кажуць, і на смак (вайсковая спецыяльнасць электрыка-падводніка пра многае гаворыць), і на колер (сам няблага малюе). А ўжо колькі лёсаў судакранулася з чалавечым “Я” былога палкоўніка МУС!.. Гэтая па-мастацку перададзеная праўда жыцця з’яўляецца тым грунтам, што лёг у аснову другога зборніка вершаў Кастуся Жмінько. Лірычнаму герою верыш у любых абставінах: ці то разважае ён над праблемамі быцця, ці то іранізуе над уедлівымі аднагодкамі, што “прывыклі ў душы лазіць маладым”, ці то прызнаецца ў каханні...

Вершы гэтай кнігі вызначаюцца разнастайнасцю рытмічнага малюнка і рыфмоўкі, у іх, асабліва пейзажных,

чытач адчуе замілавананне ад меладычнасці радка, недакучлівага гукапісу:

*На беразе, дзе ніцая вярба*
*Губляе слёзы над люстэркам плёсу,*
*Збірае сіратлівая журба*
*існы ўспамінаў у лазовы кошык.*

А між радкоў “Палявання зграі” затаілася трывога. Ашчадна адбірае аўтар моўныя сродкі, каб намаляваць асцярожную і бязлітасную воўчую зграю, што, спрагнена віжуючы па баках, ступае след у след за мацёрым. Хвіліна – і апошнім выдыхам-хрыпам устрывожыць цішыню малады алень, а белы свет змарнее яшчэ на адно жыццё.

Упэўнены, што зборнік Кастуся Жмінько знойдзе водгук у душы ўдзячнага і мудрага чытача. Верыць у гэта і сам паэт

*Усё ж стараюся, імкнуся*
*Вам не схлусіць палітрай, вершам.*
*Няхай сабе не буду першым,*
*Я застануся.*

*Мікола Сянкевіч,*
*старшы выкладчык БрДУ, сябар*
*Саюза беларускіх пісьменнікаў*

***

Дабрыдзень, мілая радзіма,
Як бачыш, я пакуль жывы.
Праталіны ў палях азімых.
Прадвесне. Смугі-паплавы.

Як сонейкі, на дзідах жыта
Блішчаць спацелыя снягі.
Нясу табе гадоў набытак
За ўсе мінулыя даўгі.

Туга разлітая ў нябёсах
Баладай-песняй жаўрука.
Скрабе (так жніўнем сушаць проса)
Па сэрцы зболенасць радка.

Дабрыдзень, мілая радзіма,
Паслухай, адагрэй душу:
У мітусні, у беганіне
Каму я болей раскажу?..

## КРАЙ

Край надзеі, Край разрухі,
І любові, і тугі,
Спраў і слоў, і – балбатухі,
Край благі, і – не благі.

Край Скарыны, Край Купалы
І – прыслужніцкай брыды,
Край гісторыі апальнай
І чарнобыльскай бяды.

Прынямонна Край азёрны,
Край Калесніка, Брыля...
З памяркоўнасцю, з пакорай –
Нескароная зямля.

Краю наш, жыві вякамі –
Волю ўваскрасі наноў!
Мы твой попел, мы твой камень –
Сціплы грунт для каранёў.

## ЧАРНОБЫЛЬСКАЯ МЯЖА

Няма сцяжыны за мяжу:
Счужэла, значыцца, зямліца.
Чарнобыль колкаю ігліцай
Мне сее чорную імжу.

А за мяжою – глухамань.
А за гарою – гора горы.
Я мушу жыць. Я сын Фядоры –
Больш у яе сыноў няма.

Прыйшоў да кожнага жытла
Нябачны воку дэман жаху.
Пракляты змрочны крыж над дахам –
Замест буслінага крыла.

…Няма сцяжыны за мяжу.
Іду – насуперак крыжу.

***

Вечар над лесам,
Вечар над лёсам.
Біцца за волю
Нам давялося.

Вецер над полем,
Вецер над долам,
Роднаму дому
Зімна ў няволі.

Над аблачынай
Сонейка грае –
Кліча Айчына
Нас дарагая.

## ВЯРТАННЕ

Чаму мне радасці няма?
З сабой хацеў пражыць у згодзе.
Спадарка ранняя зіма
Адна ў бацькоўскім агародзе.

Сцяжыну засцілае снег,
Сумёты намятае вецер.
Над хатай за мой даўні грэх
Бяроза ломіць рукі-веццe.

Павалены стары пляцень,
Хлявок паехаў галавою.
І прашчураў самотны цень
З завеяй зліўся снегавою…

# Я ІДУ…

Чыстым часам, свежым ранкам
Да цябе іду ад ганка –
Праз снягі, марозу звонкасць
Я іду, мая старонка.

Па саломцы, лёдзе тонкім,
Па рацэ, дзе бераг стромкі,
Праз пакутлівыя гаці
Я іду жыццё іначыць.

У хадзе прашу: заранка,
Асвяці мой шлях ад ганка,
Запалі вузельчык лёну
І здымі з вачэй праклёны.

Запалі агонь любоўны,
Каб я стаў яго палонным.
Каб ты, родная старонка,
Заспявала лёгка, звонка…

***

Тры ночы знічкападу…
Маладзічок, як злізаны сярпок,
Вісеў над дахам.
А знічкі кожны дзень
Па промнях сонца
Падымаліся на нябёсы,
Каб яшчэ і яшчэ раз
Мы захапляліся
Іх начным палётам.

Усё паўтараецца –
Акрамя трох начэй знічкападу.

***

Пасля нашай першай ночы белай
Гарэлі чырванню дзве кветкі любові:
Ты стала жанчынай.
Потым кожнаю раніцай
Бачыў іх на тваіх задуменных вуснах –
Яны адцвітаць пачыналі
Так рана чамусьці!..
І цяпер я шукаю
На тваіх сарамлівых шчочках
Тыя кветкі пунсовыя
Нашай першай белай ночы.

## ПРОСЬБА

Прыгадай заранкі-мары –
Іх не сцёр жыццёвы клопат.
І не трэба мемуараў:
Рана нам даваць урокі.

У пяшчоце будзь нябачнай
На краёчку ломка-крохкім,
Дакраніся ў час удзячны,
Падтрымай у дзень самотны.

Уваскрэсне наша свята!..
Збудзецца не толькі ў мроях.
Нерастрачаным багаты –
Неспакоем, цеплынёю…

## ТВАЯ ДУША

Да Леты – як падаць рукой,
Зірнеш – там сіняе бяздонне.
І працінае неспакой:
Твая душа ў маіх далонях.

***

Паўтону ў голасе,
        паўфарбы;
здымаю стрэс,
        шкадобы варты,
шукаю словаў
        для спаткання,
ды ўсе яны –.
        для развітання…

## ТАЙНА

Сукня – “віра”,
Сподні – “майна” –
Усё на месцы,
Знікла тайна.

***

Мне казалі –
        не паверыў.
Я пастукаў:
– Тук - так - тах!
Адчыніла ў сэрца дзверы:
– Ж-а-а-х!..

## НЕСПАСЦІГАЛЬНАЕ

Нам для любові не хапала чорных руж,
А белых кветак многа для разлукі:
Разладная змяя ці падкалодны вуж
Сплятаюць праз пярсцёнкі нашы рукі.

# ТРЭЦІ

Запытаў пра цябе –
Адказалі цыганкі:
– Будзеш хутка ў журбе
Ад замоваў паганскіх.

Месяц выплыў, як лунь,
Як пялёстачак вішні.
Конь адзін – не табун.
Зноўку лішні я, лішні.

Лад у спрэчках – мана.
Спёка ў сэрцы – нязгода.
Посвіст бегу каня –
Гэта ростані подых.

Даімчу да сцяны,
Дзе запыніцца вецер.
Для адзінай вясны
Застаюся я трэцім.

Вось і ёсць – у журбе
Ад замоваў паганскіх...
...Запытаў пра цябе –
Прамаўчалі цыганкі.

***

Цячэ балюча час старэчы:
Жыццёвы міг даўно на пні.
Не цешаць рэдкія сустрэчы,
Пры кожнай – горасны ўспамін.

Сціскае сэрцы настальгія,
Маленства мроіцца часцей...
– Так, мы з табою ўжо не тыя
Пад зорнай намёткай начэй.

## СУМНЫ ЖАРТ

Не наракай на век кароткі
І не гаруй – жыццё ідзе:
Яшчэ жывыя аднагодкі,
Яшчэ смяшынка ў барадзе...

***

У белым вогнішчы зіма,
І сівер грозіць барадою –
Тваё ж салодкае імя
Гарчыць на вуснах лебядою.

Кусты аблепіць снег густы,
Прыцісне долу, срэбна-сіні...
Грахі, як доўгія масты,
З табою болей не асілім.

## УСПАМІН

А памятаеш, мы калісьці,
Як дзеці, падалі на лісце,
У цуда-гурбы шапаткія?..
Радзімка дыхала на шыі…
А памятаеш, мы калісьці?..

***

Мы жыцця згулялі першы акт
У лугах мурожных, на палянах.
Добра ўспамінаць іх водар п’яны,
Не заслона бачыцца – антракт.

***

“Не пажадай!” – ёсць запавет.
Трымайся, грэшны сыне!..
Пішу ўжо ноччу, а сусед
“Рыфмуе” на пярыне.

І не турбуе іх, не суд,
Святло ў маім акенцы...
Не разбурай, зайздросны люд,
Любоўныя цяпельцы.

Той рытм між іншых пазнаеш,
Пакуль жывы, трывожыць...
“Не пажадаю” я, але ж...
Адсунь, суседзе, ложак.

## У АДРЫНЕ

Вось я ляжу –
нядаўні «геній»,
Які тут сон –
ні даць ні ўзяць!
Святло ад поўні,
водар сена –
Твае цнатлівыя калені
Грахоўна прагнуць
разгайдаць…

***

Фіранкамі ў тваім акне
Калышуцца ў лугах туманы,
Ды аксаміт Асенняй Панны
Любоўна грэе сэрца мне.

Няхай туга апавіла,
Ды ў гэтай восеньскай мярэжы
Нам лета бабіна святла
Хоць па кавалачку адрэжа.

***

Адзвінелі мае бакалы,
Апусцелі мае балконы,
Адквітнелі ў садочку калы,
Адгрымелі на вулках колы.

Парадзелі бухматыя травы.
Медуніцы ў лузе звяліся…
Мне б напою з тых траў гаркавых,
Што ў твае валасы ўпляліся.

***

Калі ты запытаеш, Божа,
На скрыжаванні раю з пеклам:
– Што выбіраеш, сын прахожы?..
Не прамаўчу:
– Паненак пекных.

***

Звекавалі, ды нешта не помніцца,
Каб хацелася рушыць і помсціць.
Успрымалі задуху як вольніцу,
І “адлігу” – як акт вераломства?..

***

Вольнаму воля – груз не цяжкі,
Што поўны мех, што пустая кішэня…
Наша воля – ядро мішэні,
За якою цікуюць стралкі.

…Ад «цанаваў», ад «яжовых»
Кошт свабоды – знак крыжовы.

***

Нас на Захад далакопы
Галавою пакладуць:
Трохі болей да Еўропы,
Трохі менш «во славу» чуць.

***

Карабель
не знае хваляў роўных:
Сцеражэ яго “падводны лёд”,
Што з-пад хвалі вытыркне раптоўна –
Праклянеш свой чын і памяркоўнасць,
Беларускі праведны народ.

***

Бяжыш, дарога, і бяжы,
Стаптаная гадамі, людам.
Апрыкла паднявольным быць,
Нібы наўючаным вярблюдам.
...А берагчы сваю двугорбасць –
Да д’ябла гэтакую гордасць!

***

Пры ўсіх уладных землятрусах
Я маю гонар беларуса!
Пераказаць – не перакажаш,
А пражыць – не ўсім адно...
Даволі шчэпці чорнай сажы,
Каб белы снег пусціць на дно.

***

У “Чорным квадраце” Малевіча
пакінута нашчадкам пытанне:
белы след апазіцыі –
гэта жыве Беларусь?

***

Памёр, дык выдалі "мандат",
Хоць пры жыцці і не цанілі.
Вянкі даставілі з Палат,
Усцешаныя: ты ў магіле.

***

Даверу просіць кандыдат:
Зарплату дам і знішчу блат!..
Я не так званы дэмакрат...
Зацерлі “андыд”, зараз – “кат”.

***

*Бабулі Ганне*

Забылі зверху пра мяне,
Пабражнічалі ўволю, –
Стаю, бядак, на бездань-дне,
І крапае са столі.
Калі ім, верхнім, да мяне?..

***

Не перакінуць нам мастоў
Ад берага, дзе гразнем самі.
Дзе мала спраў, там многа слоў,
І – рої трутняў побач з намі.

***

Паходня. Шлях. Ноч. Змрок. Блуканне.
Яшчэ далёка да світання.
Калі ж нарэшце развіднее,
Мы пастарэем, састарэем...
Ударыць гром па голлі голым,
Па кожным з нас – збалелым, кволым.
І хтось маланкава спытае:
– Каму ж, спадарства,
засвітае?..

## КРУГІ

Было нямала бітваў
За землі, за каханых,
За троны, за пасады,
За гонар чалавечы,
За волю і сцягі...
Або ў баі забіты,
Або закатаваны
Пакутнікі за праўду,
Або ступілі ў вечнасць
Ад куль людзей благіх...

А потым ходзяць світы –
Ва ўгоду ўладных кланаў
Паганяць нашы спраты,
Каб вечнае знявечыць...
І зноў – крыві кругі.

***

Падкажыце, дзе кропка апоры,
Дарагія мае землякі?..
Чухрым карак, разважна гаворым:
Год такі, час такі, век такі...

Мы даўно – верхаводкі на мелі.
Нашы душы, як рэкі, змялелі.

***

Стараюся свой след знайсці,
Арыенцір трымаць па следу,
Бо верыцца, што ў тым жыцці
З пачатку шляху мэту ведаў.

***

Вінаватыя... Лягла жалоба.
Журыцца апошняя сцяжына.
І слязіна найвышэйшай пробы
Паліць стужкі на вянках бязвінным.

## «ДАБРАТА»

Гадавала лета фарбы,
Раздавала восень барвы,
А ў куфэрачку пад скарбы,
Як заўсёды, пустата.

Не чакайце мяне, горы,
Не заві, мурашнік-горад.
Рай паўднёвы, пляж на моры –
Не згубіў нічога там.

Хай магнат даляры лічыць,
Пазычаць – не маю звычкі.
Я багаты: мяне кліча
Мой прыпынак «Дабрата».

***

Адмітусіўся парны дзень,
Акрыў самотай вечар.
Гудзе – гатовы звар'яцець –
Назола-камарэча.

Турботы дзённыя – і ў сне,
Разбіты з ложка ўстанеш,
Сябе пацешыш-падманеш
Дарэмным спадзяваннем:

Мышам-палёўкам – жытні стог,
А чалавеку – воля...
Нясём свой крыж, свой абярог –
І прагнем лепшай долі.

## ЛЯСНЫ ЭЦЮД

Усе сцяжыны на бальшак…
Мы засталіся на палянцы
І па-сялянску, проста так
Сядзім, гамонім, як пры шклянцы.

Грыбовы водар у кашах,
Лістоты шэпт, і пажаўцелы
Дзень за спіной. Гудзе шаша,
Душа і стомленае цела.

Навокал нас – трава-мурог,
Над намі – неба, як паляна.
Нам добра. Кожны з нас знямог
На едкіх, дымных скрыжаваннях.

Як у юнацтве, вышыня
Глядзіць на нас сінечы вокам,
І грыва белага каня
Хвалюе чорныя аблокі.

***

*Міколу Сянкевічу*

На беразе, дзе ніцая вярба
Губляе слёзы над люстэркам плёсу,
Збірае сіратлівая журба
Лісты ўспамінаў у лазовы кошык.

Кладзе без стомы, не шкадуе й нас,
Прытомленых жыццёвым неспакоем,
І подых успамінаў кожны раз
Мацней гарчыць лазоваю карою.

## АСІНКА

Чаму ж ты так затрапятала
Ад дотыку маёй рукі?..
Вачмі аблокаў і ракі,
Здалося, цноту ўшанавала.

## ЛІХТАРЫКІ

Праз зялёнае лісце
з сонечных праменьчыкаў
набірае святло рэдзькаўка
і нясе яго ў падзямелле
ў чырвоным ліхтарыку,
каб разгледзець
                глыбіні Зямлі.
А раніцою пра гэта
                паведамляе Сонцу…
Гэтак штовесну
                святла набіраюцца
маленькія вочкі Сонца,
а мы і не ведаем,
што гэта бела-чырвоныя
                сонечныя ліхтарыкі.
Рэдзькаўкі...

## БЯРОЗКІ

Разлучылі вас навошта
Дзве бярозкі, дзве нядолі?
Навакол цвітуць валошкі,
Запусценне ў дзікім полі.

Разыходзяцца пад небам
Дзве бялявыя сяброўкі...
...Жаль-слязу глытае глеба
З паржавелае нажоўкі.

***

Мы Новы год адсвяткавалі –
Ялінкі ў хатах трусяць смецце.
У гурбу ля пад’езда звалім...
Не пашкадуюць нават дзеці.

***

Фэст лістападу...
Бяздомны лістабой
гуляе на вуліцах горада.

***

Барвуе восень...
Лета бабіна
Шукае прытулку.

***

Зноўку снежань снежыць скрухай,
Спавівае сном ізноў,
Зноў гуляе завіруха:
У закладзе серабро.

Сее сівер сівізною
Па сумётах снегу, свету...
Ды званочкам адмысловым –
Звоніць звонкай згадкай лета.

***

Даўным-даўно з травы зляцелі росы.
Пякучы промень сонца над зямлёй
На лёгкую касьбу знішчаў прагнозы,
Уладай-сілай цешыўся сваёй.

Даўным-даўно з травы аселі слёзы:
Сухмень-траву касою ўзяць цяжэй.
У край бацькоўскі цягнуцца марозы,
І з кожным днём бліжэй,
                                        усё бліжэй...

***

Заные сэрца ад тугі,
Нахлынуць думкі ў доўгім смутку.
Наваляцца гадоў даўгі
Падманнымі грашыма ў скрутку.

Утравянее марны шлях,
Згарбаціцца зігзаг-дарога…
Хусцінкай на сухіх плячах
Дыхне жыццё з твайго парога.

***

Ісці далёка не дазволіць час,
Якога нам не хопіць на вяртанне.
“Удзячны вам. Мы не забудзем вас...” –
Для старасці гучыць як спачуванне.

## МАТЧЫНА ДОЛЯ

Ой, ляночак-вяночак,
Сінія вочанькі,
Дзе мой сыночак,
Дзе мая дочанька?

Адківаў мне лён галоўкамі,
Адспявала я салоўкаю,
Захісталася трысцінкаю,
Засталася сірацінкаю.

Не сагрэла лета грушаньку,
Астудзіла лета душаньку.
Чорны вэлюм носіць вішанька.
Ліха мне, ой, ліха-лішанька.

Зарыпелі сумна веснічкі.
Кім, самотнай, мне суцешыцца?
Паплавы запахлі восенню,
Мае дзеткі ў дом не просяцца.

Ой, ляночак-вяночак,
Сінія вочанькі,
Дзе ты, сыночак,
Што з табой, дочанька?

# БЯЗДОМНЫ

Яго жыццёвая дарога
Цякла павольна, без падзей.
Ад цеплыні сваёй “бярлогі”
Ён адарваўся ў вір надзей.

Ды не знайшоў другога дому:
Інакшы дом – інакшы лад.
Назоўку Воўк далі чужому
І не паклікалі назад.

Вось і брыдзе, як воўк па пожні,
Шукае воўчы закуток,
А поўня вокам, скрухі поўным,
Высочвае слядоў уток.

Няўдачы цягнуцца; штоночы
На поўню, хоць і чалавек,
З вятрыскам вые ён па-воўчы,
Бы просіць скончыць воўчы век.

## ПАХАВАННЕ Ў ВЫВЕРАХ

Стаіць няўцямна на памосце
Самотны гаспадар святліцы:
Прыйшлі няпрошаныя госці –
Няма куды слязе скаціцца.

## ПАЛЯВАННЕ ЗГРАІ

Зімка восені не роўня.
Халады – кажух адзень?
Асвятляе блякла поўня
Зграю, што праз лес ідзе.

Холад у вачах звярыных,
Згаладалых і пустых.
Выжыць – жылы рваць павінны
Тым, хто мае капыты.

Зграя спрагнена віжуе
За мацёрым след у след…
У ляскуален начуе…
Выдых – і збяднее свет.

***

Зранку лепей піць віно:
Шклянку бачыш, бачыш дно.

Весялей пачатак дня.
Хто наліў – усе радня.

Галава пры “бадуне”
Не пытае: піць ці не.

Верыш – ісціна ў віне –
Гэта значыць: там, на дне...

Вечар. Зоркі зіхацяць.
Нам бы ранак не праспаць.

***

*Алесю Каско*

Маё сэрца ляціць вінавата,
Як між зорак апошняя знічка,
Над старою пахіленай хатай,
Над сівою засмучанай дзічкай.

Над сцяжынкай, знямелай ад стомы,
Над бяздомнаю птушкай на плоце…
Сэрца-знічка да вокнаў знаёмых
Не зляціць – а згарыць у палёце...

## АЛЬБОМНАЕ

*С. В.*

Працерла вочкі рана
Святлана-панна.
– Ну, што чуваць? – званю.
– Быць дню!

***

*Міхасю Скоблу*

Вясёлыя на сэрцы ноткі:
Гучаць пародыі “ля Скобла”...
Паэтаў век і так кароткі –
А ты аглобляю, аглобляй...

## АСЦЯК І КРАПІВА

– Такі ты ўчэпісты й калючы…
– Дык і цябе не праміну́ць.
Сваёю ласкаю пякучай
Не можаш, каб не сцебануць.

## ПЯНЁК

Вось так і нас жыццё ламае,
Як дрэвы вецер і гады.
Пад старасць мы спакусу маем
У душы лезці маладым.
…Струхнеў, браточак. Мох на пне,
А пнешся:
– Слухайце мяне!

## ЭПІГРАМА

*У. С.*

У залу, дзе гучаў арган,
Жыло высокае мастацтва,
Унёс вайсковы барабан
І за сабой дзвярыма кляцнуў.

## ІРАНІЧНАЕ ФІЛФАКУ

Вам, – ад старога паўмастака, паўпаэта, –
Ахвярую "Маладое бабіна лета".
Эцюдны "шэдэўр" на філфаку трымайце:
Сяк-так навучылі – так-сяк успрымайце.

***

Згасне печка.
Згасне свечка.
Не раздзьмухнецца кадзіла.
І любоў не будзе вечнай:
Не сустрэнемся ў магіле.

Сціхнуць песні,
Сціхне вечар.
Ноч пагасіць жырандолю.
Падрыхтуе нам на плечы
Новы ранак нашу долю.

***

Ад якіх далёкіх продкаў
Пераходзіў лёс да нас
І з якіх духоўных сродкаў
Дзецям мы дамо аванс?..

***

Не назапасіў праўнукам дабра,
Свой век, магчыма, дажыву ў бядоце.
Жыццё не адарыла футраю бабра,
Хаця панішчыў зубы на рабоце.

***

Даўнішні плюш ад молі сушым,
Даношваем і дажываем...
Няўжо і ў пекле нашым душам
“Абноўкі” беднасць выбірае?..

***

Пасля ўзлётаў – балючыя спады –
Памятаць гэта трэба заўжды.
...У запас выправаджваюць га́ды.
А ў адстаўку, вядома ж, – гады.

## ПАДХАЛІМУ

Дзятлам-птушкаю тутукае,
Кажа: пра Радзіму дбае –
Затаптаны і затурканы,
Пекла называе раем.

***

Шчэ, думаеш, трымаеш лёс за плечы,
На поспехі нацягнуты аброжак?..
Не радуйся! Гнілы кажух авечы
Не ўтоіць барановых рожак.

***

Мы час з’ядаем, нас глытае час,
Марнуе ў звыклай беганіне.
Нядуж Пегас, не цягне на Парнас,
І наша ленасць – глейнай каляінай.

...Мы пад гарой.
                Гара страмкая:
Парнас паўзучых
                не прымае.

***

– Ну як жывеш, сястра Адарка?
– Жыву і надта не бядую...
– А слёзы?
– Бач, у гаспадарцы
То хрэн я маю, то цыбулю.

## ПРАЦЯГ

Да ісціны цярновы шлях.
Няхай жа Бог дадасць Вам летаў,
Яе Сынам, яе Паэтам,
Чый сімвал веры – мне працяг.

Наканавана несці сцяг
Хоць колькі крокаў:
Я – працяг.

***

Раней бывалі сны:
Над хмарамі кружляю.
Цяпер усё часцей
Лячу з абрыву ўніз.

Мой Божа мілы,
Свечкай – крылы таюць!..
Дык што далей
Ты мне параіш з-пад макавак званіц?

***

Шукаю слова
Дзеду і матулі,
Жанчыне любай і сябрам сваім…
Бывае, пачарнее свет благі,
Паводкай час размые берагі
маёй ссівелае тугі,
назола-смутак сэрца ахіне:
«Ці знойдзе нехта слова для мяне?..»

***

Не пападае ў колер фарба,
Жыццё праходзіць бокам-скокам.
Мне на хвасце нясе сарока
Падманнай барвы.

Усё ж стараюся, імкнуся
Вам не хлусіць палітрай, вершам.
Няхай сабе не буду першым,
Я застануся.

# З ПОЛЬСКАЙ ПАЭЗІІ

**************************

*Рычард Карнацкі*

## КАХАННЕ Ў ЛІСТАПАДЗЕ

а гэта цікава
каханне ў лістападзе
калі на гарачую
галаву
туман сярэбраны кампрэс кладзе
а сэрца разгайданае
і разбітае
з ветрам у танцавальнай згодзе
клён залаты
вось гэта і ёсць
каханне ў лістападзе

## ЖАДАННЕ

лепей усяго буду
шрацінкай
лісцікам зялёным
на ветры
тады маё слова
не рыне
галавою на дол
у прорву
нямой цішы
без дна

## ЧАСАМ

Часам маўчанне асобаў і рэчаў
паведамяць болей
чым адмысловы прамоўца сярод натоўпу

## НАДЗЕЯ

Пакуль згасну
расцалую свет
прама ў вусны
каторыя кажуць
праўду
і толькі праўду

## АНЕМОНА

Анемона
найчысцейшая паэзія.
Не трэба мелодыі
не трэба рытму
не трэба слоў
Даволі самой анемоны
................................. і Ты.

## МАЯ ЛЮБОЎ – КАРЦІНА

Мая любоў
павенчана на вярбе
з зялёным ветрам
заплеценым у кароне
Тваіх разбуджаных валасоў
непаслухмяных
звар’яцелых
дрыготкіх як аленяня
у акладзе
фіялетавага надвячорка

*Крысціна Карнацка*

## ПАЖАДАННЕ НА ДЗЕНЬ НАРАДЖЭННЯ

Не жадайце мне сто гадоў
дык і навошта мне сто гадоў
нямых без чуласці і волі
навошта мне сто гадоў
калі няма сіл іх нават палічыць
нат пагасіць свечкі на юбілейным торце?
навошта мне сто гадоў
мігатлівых балючых і глухіх
для мукаў самым родным
Божа! дай мне столькі гадоў
каб збыцца ў зямным жыцці
і каб наступнае маё месца
не было пеклам.

## ЗМЕСТ

Яшчэ пра галоўнае *Мікола Ссянкевіч* ................................ 3

*** Дабрыдзень, мілая радзіма ........................................ 7
Край ........................................................................ 8
Чарнобыльская мяжа ................................................. 9
*** Вечар над лесам ................................................ 10
Вяртанне ................................................................. 11
Я іду ....................................................................... 12
*** Тры ночы знічкападу ............................................ 13
*** Пасля нашай першай ночы белай ..............................14
*** Прыгадай заранкі-мары ...........................................15
Твая душа ................................................................. 16
*** Паўтону ў голасе ................................................ 17
Тайна ........................................................................18
*** Мне казалі ..............................................................19
Неспасцігальнае ...................................................... 20
Трэці ....................................................................... 21
*** Цячэ балюча час старэчы ...................................... 22
Сумны жарт ............................................................. 23
*** У белым вогнішчы зіма ........................................ 24
Успамін .................................................................... 25
*** Мы даўно згулялі першы акт ................................ 26
*** «Не пажадай!» – ёсць запавет ............................... 27
У адрыне .................................................................. 28
*** Фіранкамі ў тваім акне ........................................ 29
*** Адзвінелі мае бакалы .......................................... 30
*** Калі ты запытаеш, Божа ...................................... 31

*** Звекавалі, ды нешта не помніцца ............................ 32
*** Вольнаму воля – груз не цяжкі ................................ 33
*** Нас на Захад далакопыv ...................................... 34
*** Карабель ........................................................... 35
*** Бяжыш, дарога, і бяжы ......................................... 36
*** Пры ўсіх уладных землятрусах ................................37
*** У «Чорным квадраце» Малевіча ................................ 38
*** Памёр, дык выдалі «мандат ..................................... 39
*** Даверу просіць кандыдат ....................................... 40
*** Забылі зверху пра мяне ......................................... 41
*** Не перакінуць нам мастоў ...................................... 42
*** Паходня. Шлях. Ноч. Змрок. Блуканне ........................ 43
Кругі ...................................................................... 44
*** Падкажыце, дзе кропка апоры ................................. 45
*** Стараюся свой след знайсці .................................... 46
*** Вінаватыя… Лягла жалоба ...................................... 47
Дабрата ................................................................... 48
*** Адмітусіўся парны дзень ....................................... 49
Лясны эцюд .............................................................. 50
*** На беразе, дзе ніцая вярба ..................................... 51
Асінка ..................................................................... 52
Ліхтарыкі ................................................................. 53
Бярозкі .................................................................... 54
*** Мы Новы год адсвяткавалі ..................................... 55
*** Фэст лістападу .................................................... 56
*** Барвуе восень ...................................................... 57
*** Зноўку снежань снежыць скрухай ............................. 58

*** Даўным-даўно з травы зляцелі росы ........................ 59
*** Заные сэрца ад тугі ................................................ 60
*** Ісці далёка не дазволіць час ...................................... 61
Матчына доля ........................................................... 62
Бяздомны ................................................................ 63
Пахаванне ў Выверах .................................................. 64
Паляванне зграі ......................................................... 65
*** Зранку лепей піць віно ............................................. 66
*** Маё сэрца ляціць вінавата ........................................ 67
Альбомнае ............................................................... 68
*** Вясёлыя на сэрцы ноткі ............................................ 69
Асцюк і крапіва ......................................................... 70
Пянёк ..................................................................... 71
Эпіграма ................................................................. 72
Іранічнае філфаку ...................................................... 73
*** Згасне печка ......................................................... 74
*** Ад якіх далёкіх продкаў ............................................ 75
*** Не назапасіў праўнукам дабра .................................... 76
*** Даўнішні плюш ад молі сушым .................................... 77
*** Пасля ўзлётаў – балючыя спады .................................. 78
Падхаліму ............................................................... 79
*** Шчэ, думаеш, трымаеш лёс за плечы ........................ 80
*** Мы час з’ядаем, нас глытае час ................................ 81
*** – Ну як жывеш, сястра Адарка? ................................ 82
Працяг ................................................................... 83
*** Раней бывалі сны .................................................. 84
*** Шукаю слова ....................................................... 85
*** Не пападае ў колер фарба ....................................... 86

## З ПОЛЬСКАЙ ПАЭЗІІ

*Рычард Карнацкі*
Каханне ў лістападзе ........................................ 87
Жаданне ........................................ 88
Часам ........................................ 89
Надзея ........................................ 90
Анемона ........................................ 91
Мая любоў – карціна ........................................ 92

*Крысціна Карнацка*
Пажаданне на дзень нараджэння ........................................ 93

# ДЗВЕ КНІГІ КАСТУСЯ ЖМІНЬКО

У гэтым годзе пры падтрымцы Таварыства аховы краявіда ў Гайнаўцы выйшлі з друку адразу дзве кнігі берасцейца Кастуся Жмінько: зборнік вершаў “Наканаваны неспакой” і кніга афарыстычных выслоўяў “Кастусь казаў...”. Перш чым павесці размову пра навінкі, лічым патрэбным сказаць некалькі слоў пра самога паэта.

Кастусь (Канстанцін Фёдаравіч) Жмінько нарадзіўся 17 лютага 1941 года ў вёсцы Пугачова (з 1979 года ў межах Брэста). Пасля заканчэння сярэдняй школы № 4 працаваў электрамантажнікам, служыў у ваенна-марскім флоце. Дэмабілізаваны электрык-падводнік быў прыняты на працу мастаком гарадскіх кінатэатраў, пэўны час служыў мытнікам, адначасова вучыўся на філалагічным факультэце Брэсцкага педінстытута. Перспектыўнага маладога спецыяліста накіроўваюць на працу ў праваахоўныя органы. У званні палкоўніка з пасады начальніка аддзела абласнога ўпраўлення ўнутраных спраў у лістападзе 1994 года выйшаў на пенсію.

Мае дзяржаўныя ўзнагароды, яго імя занесена ў “Кнігу Гонару” МУС БССР.

Аўтар зборніка вершаў “Між вамі” (1999 г.). Вершаваныя падборкі і асобныя творы друкаваліся ў калектыўным зборніку “Дзядзінец. Паэзія Берасцейшчыны” (1999 г.), альманаху “Берасцейскія карані” (1993, 2002 гг.), у літаратурна-мастацкіх часопісах “Бярозка” (1999 г.) і “Полымя” (2000 г.). Паасобныя творы перакладзены на польскую, рускую і ўкраінскую мовы.

Імя Кастуся Жмінько сярод аўтараў кніг пра Уладзіміра Калесніка “Пасланец Праметэя” і Ядвігу Чарняўскую “Святло дабрыні” (абедзве выйшлі ў 2007 г. у Брэсце).

Апошнім часам спрабуе свае сілы ў напісанні празаічных твораў малога жанру, а таксама ў перакладах з польскай мовы.

Імя Кастуся Жмінько вядома прыхільнікам паэтычнага слова з сямідзесятых гадоў па публікацыях у перыядычным друку, але першая кніга паэзіі “Між вамі...” з’явілася толькі ў канцы дзевяностых, што засведчыла патрабавальнасць аўтара да слова, высокую ступень самакрытычнасці.

Не проста і не хутка рыхтаваўся таксама гэты зборнік. Чытач са стажам заўважыць, што многія вершы паэта былі створаны ў тую пару, калі пачыналася наша дзяржаўная незалежнасць, таму і нясуць яны адзнаку часу, адметную публіцыстычнасць, узнёсласць, вылучаюцца энергіяй радка. Але ў той жа час аўтар не зрываецца на крык, не пераходзіць на пустую рыторыку.

“Наканаваны неспакой” – зборнік сталага, багатага пражытым творцы пра галоўнае: чалавечую і грамадзянскую пазіцыю нашага сучасніка на зямлі, яго месца на “планеце людзей”. Добра сказала пра гэта Ніна Мацяш: “Яго ціхмяны, вычулены, шчымліва-роздумны паэтычны голас заўсёды адметны не толькі жывой інтанацыяй адданай любові да роднай зямлі, мовы і духоўнай спадчыны беларускага народа, але й сыноўнай адказнасцю за яго будучыню.”

У сваёй творчасці Кастусь Жмінько найперш вяртаецца да вытокаў. Уражваюць радкі верша, прысвечанага Алесю Каско:

*Маё сэрца ляціць вінавата,*
*Як між зорак апошняя знічка,*
*Над старою пахіленай хатай,*
*Над сівою засмучанай дзічкай.*

Любімая паэтычная форма аўтара – кароткі (чатыры – восем радкоў) верш з выразнай, лаканічнай, неразмытаю думкай:

*Стаіць няўцямна на памосце*
*Самотны гаспадар святліцы:*
*Прыйшлі няпрошаныя госці –*
*Няма куды слязе скаціцца.*

(“Пахаванне ў Выверах”)

Кастусь Жмінько ведае жыццё, як кажуць, і на смак (вайсковая спецыяльнасць электрыка-падводніка пра многае гаворыць), і на колер (сам няблага малюе). А ўжо колькі лёсаў судакранулася з чалавечым “Я” былога палкоўніка МУС!.. Гэтая па-мастацку перададзеная праўда жыцця з’яўляецца тым грунтам, што лёг у аснову другога зборніка вершаў Кастуся Жмінько. Лірычнаму герою верыш у любых абставінах: ці то разважае ён над праблемамі быцця, ці то іранізуе над уедлівымі аднагодкамі, што “прывыклі ў душы лазіць маладым”, ці то прызнаецца ў каханні...

Вершы гэтай кнігі вызначаюцца разнастайнасцю рытмічнага малюнка і рыфмоўкі, у іх, асабліва пейзажных, чытач адчуе замілавананне ад меладычнасці радка, недакучлівага гукапісу:

*На беразе, дзе ніцая вярба*
*Губляе слёзы над люстэркам плёсу,*
*Збірае сіратлівая журба*
*Лісты ўспамінаў у лазовы кошык.*

А між радкоў "Палявання зграі" затаілася трывога. Ашчадна адбірае аўтар моўныя сродкі, каб намаляваць асцярожную і бязлітасную воўчую зграю, што, спрагнена віжуючы па баках, ступае след у след за мацёрым. Хвіліна – і апошнім выдыхам-хрыпам устрывожыць цішыню малады алень, а белы свет змарнее яшчэ на адно жыццё. Упэўнены, што зборнік Кастуся Жмінько "Наканаваны неспакой" знойдзе водгук у душы ўдзячнага і мудрага чытача. Верыць у гэта і сам паэт:

*Усё ж стараюся, імкнуся*
*Вам не схлусіць палітрай, вершам.*
*Няхай сабе не буду першым,*
*Я застануся.*

Ёсць кнігі, якія нельга напісаць у маладосці: на іх мае права толькі мудрая сталасць. Такой кнігай, на маю думку, з'яўляецца зборнік афарыстычных выслоўяў "Кастусь казаў...".

Ужо перагортваючы старонкі першай кнігі Кастуся Жмінько “Між вамі” (1999 г.), можна было заўважыць: асаблівую прывабнасць, лагічную завершанасць надаюць творам менавіта афарыстычныя канцоўкі, якія атрымалі з часам права на самастойнае жыццё. Дарэчы тут будзе ўспомніць радкі паэта (на той, перабудовачны, час высокапастаўленага кіраўніка, якому здаровы духоўны стрыжань не дазволіў сесці “на ланцуг спакусы на чырвоным сытным двары”): “Твой шлях ёсць пошук шляху”, “А сябры гараць, бы знічкі, – папаўняюць Млечны Шлях”, “З унукам гадзіннік новы пра што павядзе размовы?” ці зноў жа, пра сябе самога : “Жмінько не браў паўнюткай жменяй, ды нат у шчэпці не хапаў”. А хапалі і ха́палі. З прайдзісветамі і хапугамі змагаўся па абавязку службы (не шкадуе едкага слова і цяпер) Кастусь Фёдаравіч. На мой погляд, яго выказванні на адрас чыноўнай і наменклатурнай набрыдзі – найбольш моцнае звяно і ў першым раздзеле, “Сабе ды іншым”, і ў другой частцы дадзенай кнігі. Чаго вартае толькі “Згарэла на злодзею шапка – выдалі папаху”!? Вобразна і дакладна. Пакрывіць душою той з нас, хто скажа, што ў яго царстве-ведамстве такім чынам ніколі не ўлагоджвалі высокапастаўленых “пагарэльцаў”. А як вы думаеце, пра каго наступны афарызм-загадка: “Даўганосы і цыбаты сцежкі круціць каля хаты”? Не, бусел тут ні пры чым.

Не ўтрымаюся, каб паводле Жмінько даць тлумачэнне некаторым этычным катэгорыям, хоць бы наступным: фанабэрыстасць – “высакаверхая шапка на галаве амбітнага недаростка, да таго ж не свая”; праўда – “пакутлівае немаўля, якому хлусня-павітуха балюча спавіла

цельца, не даючы магчымасці свабодна дыхаць”... Як мне здаецца, афарыстычныя выказванні першай часткі кнігі – арыгінальны, аўтарскі жанр Кастуся Жмінько, своеасаблівыя “малыя” формы публіцыстыкі.

Афарызмы другой часткі надзвычай разнастайныя тэматычна. Іх, пры ўсім жаданні, цяжка было “ўбіць” нават ва ўмоўныя раздзелы і давялося збіраць у апошнім, аднайменным з назвай кнігі. Аўтар разважае над такімі праблемамі як дабро і зло, беднасць і багацце, розум і дурнота, народ і ўлада, жыццё і смерць...

Але не ўсё так змрочна. Несумненна, удзячны чытач не аднойчы шчыра засмяецца, а то і соладка прыцмокне, чытаючы досціпы, аб’яднаныя пад назвай “Дазволь, маладзіца...”. Каб паказаць, што гэта сапраўды так, прывяду, грэшны, некалькі назіранняў, з якімі можа не пагадзіцца хіба што “адпеты” жанчынаненавіснік. Вось яны: “І пад удавой салома трэцца”, “Не хвалі халявы з паненкай на лаве”, “Калена аб калена трэцца – душа саграецца”...

Шчыра жадаю Кастусю Жмінько новых кніг паэзіі (ведаю, што рыхтуецца яшчэ адзін зборнік), прозы (думаю, такая кніга абавязкова напішацца), а таксама творчых удач у выяўленчым мастацтве. Няхай ніколі не будзе пераранасычанасці пастаянствам і творчыя Музы заўсёды спадарожнічаюць на шляху “ў свет за добрымі людзьмі”.

*Мікола Сянкевіч*